# СТАЎКА НА КАРЫСНЫЯ ВЫКАПНІ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Беларускія геолагі летась пасля сейсмаразведачных работ знайшлі новыя запасы нафты. Па словах Марыі Шастак, пасля работ на нафтаперспектыўнай структуры «Жукоўская» забяспечаны прырост рэсурсаў нафты (па катэгорыі D0) у колькасці 457 тысяч тон.

Як паведамілі ў Навукова-вытворчым цэнтры па геалогіі (НВЦ), усяго на пачатак гэтага года ў Беларусі адкрыта і разведана 96 радовішчаў нафты. У 2023 годзе «чорнага золата» здабыта 1,877 мільёна тон, што значна больш, чым у папярэднія гады. У НВЦ па геалогіі падлічылі, што на бягучы момант рэшткавыя прамысловыя вымальныя запасы нафты складаюць 44,8 мільёна тон. Толькі з 2015 да 2023 года адкрыта 14 радовішчаў нафты.

Што датычыцца інвестпраектаў, можна адзначыць праект «Беларуснафты» ў Маларыцкім раёне па здабычы і перапрацоўцы пяску на радовішчы «Хацілаўскае». Пясок будзе выкарыстоўвацца для гідраразрыву пласта і павышэння аддачы пры здабычы нафты», — праінфармавала Марыя Шастак.

## Мел, пясок і гліна

Летась завершана дэталёвая разведка пяску для вытворчасці сілікатных вырабаў на участку радовішча «Слабада» ў Мінскім раёне. Там былі падлічаны яго запасы ў колькасці 7,2 мільёна тон. «Гэтыя запасы будуць рэзервовай сыравіннай базай для Мінскага камбіната сілікатных вырабаў, бо радовішча размяшчаецца досыць блізка», — адзначыла Марыя Шастак.

Паводле яе слоў, таксама выяўлены перспектыўныя ўчасткі мелу, які можа выкарыстоўвацца для вытворчасці цэменту, у радыусе 40 кіламетраў ад ААТ «Краснасельскбудматэрыялы». Гэтыя ўчасткі могуць быць рэзервовай сыравіннай базай на перспектыву для развіцця гэтага прадпрыемства.

Акрамя таго, праведзены работы да вывучэння радовішчаў пяску, які выкарыстоўваецца ў шкляной галіне. У асноўным радовішчы размешчаны паблізу ААТ «Гомельшкло» — філіяла Гомельскага ГАКа. Выяўлены найбольш перспектыўны ўчастак — радовішча «Усохскае».

Спецыялісты займаліся і ўдасканаленнем тэхналагічных рашэнняў у галіне здабычы і перапрацоўкі глін радовішча «Крупейскі сад» у Лоеўскім раёне. Яго распрацоўвае «Лоеўбудматэрыялы». Даследаванні пацвердзілі, што на глыбіні 6-8 метраў залягае пласт глін, якія прыдатныя для вытворчасці керамічных вырабаў. «На жаль, пласт залягае досыць глыбока. Рашэнне аб здабычы будзе прымаць кіраўніцтва прадпрыемства ва ўзаемадзеянні з Мінпрыроды, Гомельскім аблвыканкамам у залежнасці ад эканамічных паказчыкаў, запатрабаванасці і магчымасці здабычы глін», — дадала Марыя Шастак.

Таксама ў 2023 годзе даследавалі радовішча каоліну «Сітніца». Па даручэнні ўрада радовішча плануецца да ўводу ў распрацоўку ў 2024 годзе. Пачаліся і работы па даследаванні радовішча бентанітавых глін «Астражанскае», цяпер яны працягваюцца. «Да канца 2025 года па ўсіх радовішчах, названых у пераліку, будуць падрыхтаваны тэхніка-эканамічныя абгрунтаванні мэтазгоднасці ўводу ў распрацоўку», — удакладніла прадстаўнік Мінпрыроды.



На думку Марыі Шастак, беларуская прадпрыемствы імкнуцца больш выкарыстоўваць айчынную сыравіну, павялічваць аб'ёмы яе здабычы, рэалізоўваць інвестыцыйныя праекты. «Фіксуецца павелічэнне здабычы шкляных пяскоў, калійных соляў, будаўнічага і абліцовачнага каменя.

## Па базальтах ходзім

Па словах кансультанта, летась завяршыліся пошукавыя работы па выяўленні радовішчаў базальтаў з глыбінёй залягання да 100 метраў у межах Пінскай і Іванаўскай плошчаў Брэсцкай вобласці. Выяўлены рэсурсы базальтаў у аб'ёме 648 мільёнаў тон.

Варта нагадаць, што летась ва ўзаемадзеянні з Мінбудархітэктуры, Нацыянальнай акадэміяй навук, тэхналагічнымі ўніверсітэтамі Мінпрыроды арганізавала мерапрыемствы, накіраваныя на пашырэнне пераліку здабывальных відаў карысных выкапняў, якія максімальна скарачаюць імпарт.

У тым ліку ўдасканальваюцца тэхналогіі здабычы карысных выкапняў і распрацоўкі радовішчаў. Так, распараджэннем прэм'ер-міністра Беларусі ў мінулым годзе былі зацверджаны пералік перспектыўных радовішчаў. У іх лік увайшлі радовішчы каоліну «Сітніца», бентанітавых глін «Астражанскае», базальтаў «Навадворскае», баксіт-даўсанітавых руд «Заазернае».

«Што датычыцца радовішча «Навадворскае», летась завершана дэталёвая разведка, яно падрыхтавана да прамысловага асваення. Па выніках распрацаванага тэхніка-эканамічнага абгрунтавання пацверджана мэтазгоднасць уключэння гэтага радовішча ў распрацоўку са стварэннем горнаабагачальнага камбіната (ГАКа) магутнасцю 250 тысяч тон у год. Паралельна са стварэннем камбіната плануецца стварэнне некалькіх вытворчасцяў па выпуску прадукцыі з базальтаў: мінераловатных пліт, базальтавага бесперапыннага валакна, а таксама элементаў добраўпарадкавання. Прапрацоўваецца пытанне аб вызначэнні арганізацыі-заказчыка па праектаванні дадзенага ГАКа», — расказала Марыя Шастак.

Яна адзначыла, што запуск поўнага цыкла вытворчасці (распрацоўка кар'ера, будаўніцтва яшчэ трох прадпрыемстваў) дазволіць цалкам замясціць імпарт базальту ў нашай краіне ў аб'ёме 75-80 тысяч тон у год і стварыць не менш чым 400 працоўных месцаў.

## Планы на перспектыву

Сёння геолагі ў пошуку новых радовішчаў карысных выкапняў адкрываюць «усю табліцу Мендзялеева», але пытанне ў тым, што вялікую іх колькасць распрацоўваць эканамічна не выгадна.

Напрыклад, як расказаў начальнік аддзела геалогіі і мінералогіі крышталічнага падмурка філіяла «Інстытут геалогіі» НПЦ па геалогіі Алег Піскун, у краіне ёсць залежы берылію, які актыўна выкарыстоўваецца ў авіяцыйнай галіне і металургіі. Ёсць адкрытыя яшчэ ў часы СССР залежы іншых металічных руд, але размешчаны яны на глыбінях, якія не дазваляюць здабываць іх з прыбыткам. Ці, напрыклад, ёсць у нашых глыбінях рэдказямельныя металы, а таксама золата, плаціна, медзь і серабро. Толькі размешчаны яны на глыбіні 5-6 кіламетраў.

Але ёсць і тыя карысныя выкапні, здабыча якіх выгадная. Распараджэннем прэм'ер-міністра зацверджаны пералік радовішчаў карысных выкапняў, перспектыўных для новай распрацоўкі. «На 2024-2025 гады ў рамках дзяржпраграмы чакаецца прырост прагнозных рэсурсаў нафты ў колькасці 550 мільёнаў тон, пяску для вытворчасці шкла — 19 мільёнаў тон, гліны тугаплаўкай — 6,9 мільёна тон», — прывяла зацверджаныя планы прадстаўнік Мінпрыроды.

## Інтэрактыўная карта мінерально-сыравіннай базы

Таксама працягвалася геалагічнае карціраванне тэрыторыі краіны. «Такія працы спрыяюць павышэнню ўзроўню геалагічнай вывучанасці Беларусі і аблічбоўкі даных. Выпускаюцца карты новага пакалення. Геалагічнае карціраванне дазваляе сфарміраваць новае ўяўленне аб геалагічным будынку нашай краіны з улікам забудовы, змены ландшафту. Выкарыстанне гэтых карт будзе спрыяць больш дэталёвай прапрацоўцы далейшых даследаванняў, вывучэнню новых перспектыўных плошчаў», — звярнула ўвагу прадстаўнік Мінпрыроды. Усё гэта трэба, але...

Каб мець аператыўную, даступную і актуальную інфармацыю аб стане мінерально-сыравіннай базы, у краіне па даручэнні ўрада і Мінпрыроды пачата распрацоўка інтэрактыўнай карты. Сёння сістэма праходзіць тэставую эксплуатацыю і да канца года будзе запушчана ў адкрытым доступе. Як адзначыла дырэктар Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі дзяржаўны цэнтр па геалогіі» Марына Васілюк, дадзеная сістэма дазволіць вырабляць выбарку па розных крытэрыях тых ці іншых участкаў нетраў, адлюстроўваць іх на картаграфічнай аснове і аўтаматычна фарміраваць аналітычныя даведкі аб стане выбраных аб'ектаў або аб стане мінерально-сыравіннай базы абранага рэгіёна.

**Сяргей КУРКАЧ.**


Статусбанк

**ОАО «СтатусБанк»**
www.stbank.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
### 31 марта 2024 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2024 год | 2023 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 74 076 | 41 139 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 33 133 | 32 941 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 154 199 | 154 512 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 108 120 | 91 513 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 7 421 | 7 172 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 1 888 | 2 206 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | **378 837** | **329 483** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | - | 133 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 291 331 | 246 209 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 3 050 | 2 305 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 294 381 | 248 647 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 43 000 | 43 000 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 14 885 | 14 131 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 73 | 73 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 26 498 | 23 632 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 84 456 | 80 836 |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | **378 837** | **329 483** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
### за 1-й квартал 2024 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2024 год | 2023 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5 833 | 3 947 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 2 382 | 762 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 3 451 | 3 185 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 425 | 764 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 061 | 455 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 364 | 309 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7 999 | 1 470 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 761 | (964) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 144 | 300 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 5 947 | 4 535 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 228 | 167 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 5 022 | 1 526 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 402 | 228 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **3 620** | **1 298** |

Председатель Правления

Главный бухгалтер

Дата подписания: 2 апреля 2024 г.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 26 выдана Национальным банком Республики Беларусь 26 февраля 2024 года. УНП 807000043.*